**А.П.Грыцкевіч,**
*прафесар*

# ВЫТОКІ ЯЗЫЧНІЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў І ТЫСЯЧАГОДДЗІ

На мяжы III і II тысячагоддзяў да н. э. у Еўропу з Азіі прыйшлі плямёны арыйцаў, або індаеўрапейцаў. Некаторыя даследчыкі лічаць, што прыйшлі яны дзвюма хвалямі. Індаеўрапейцы мелі агульнае паходжанне, блізкія мовы, пэўную агульнасць фізічных рыс, падабенства звычаяў і ўяўленняў, міфалогіі і пантэона.

Індаеўрапейскія плямёны ў перыяд бронзавага веку (пачынаючы з канца III тысячагоддзя да н.э. і да VIII—VII стст. да н.э.) рассяліліся на тэрыторыі Беларусі, асіміляваўшы мясцовае насельніцтва угра-фінскага паходжання. Тэрыторыю цяперашняй Беларусі ў жалезным веку (VII—VI стст. да н.э. — VIII ст. н.э.) займалі ўсходнія балцкія плямёны. З індаеўрапейскай (арыйскай) агульнасці балцкія і славянскія плямёны вылучыліся пазней, чым германцы. Таму спачатку адрозненні ў культуры і духоўным жыцці былі не такія адметныя, як гэта сталася пазней.

Пачынаючы з VI—VII стст., у сувязі з вялікім перасяленнем у Еўропе і пастаяннымі нападамі качэўнікаў з Цэнтральнай Азіі, а таксама ў сувязі з павелічэннем колькасці насельніцтва, славянскія плямёны пачалі перасяляцца на поўнач. Тэрыторыя сучаснай Беларусі, асабліва на ўсходзе і ў цэнтры, была канчаткова заваявана славянскімі плямёнамі ў VII—IX стст. Славянскія плямёны прыйшлі сюды з поўдня і з захаду, з тэрыторыі сучаснай Польшчы. У выніку гэтага заваявання ўтварылася этнічная агульнасць двух блізкіх па культуры і паходжанні этнасаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асіміляцыяй балтаў славянамі. Славянская мова выцесніла балцкую. Запанавала і славянская культура. Славянская каланізацыя раёна ракі Нёман працягвалася і пазней.

На тэрыторыі Беларусі ў VIII—IX стст. знаходзіліся ўстойлівыя этнічныя аб'яднанні, якія ўтварыліся стыхійна і якія згадваюцца ў "Аповесці мінулых гадоў" — крывічы-палачане, дрыгавічы і радзімічы. Балцкія дыялекты зрабілі вялікі ўплыў на мову крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.

Рэлігія і магія адыгрывалі асноўную ролю ў культуры славянскіх плямён у Беларусі. Рэлігіяй усходніх славян было язычніцтва з пантэонам багоў, шматбожжам, з абагаўленнем навакольнай прыроды. Язычніцтва нашага рэгіёна адрознівалася ад агульнаславянскіх уяўленняў. Язычніцтва ўсходніх славян генетычна паходзіла ад шматбожжа, ад пантэона старажытнаіндыйскай рэлігіі. Але за некалькі тысячагоддзяў вандравання ў Азіі і ў Еўропе, а таксама з-за новых кліматычных умоў, новага асяроддзя і спосабаў вядзення гаспадаркі, падзелу індаеўрапейскай агульнасці на групы, новых перасяленняў змяніліся і рэлігійныя погляды нашых далёкіх продкаў.

Ва ўсходнеславянскім язычніцтве ў Беларусі адбіліся і захаваліся адрозненні племянных поглядаў, звязаныя з умовамі рассялення на новых лясіста-балоцістых прасторах.

Ад арыйскага перыяду язычніцкага пантэона славянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі захаваліся назвы вышэйшага Бога — Дзіў, Род, Сварог, Стрыбог, Святавіт. Гэта імёны Бога, агульнага для ўсіх індаеўрапейскіх народаў, але ўжо ў славянскіх племянных уяўленнях. Імя Дзіў паходзіць ад санскрыцкага слова "дзіўос". Некаторыя даследчыкі звязваюць гэтае імя са словам "дый" — дзень. Імя Сварог паходзіць ад санскрыцкага "свар" (неба). Назва Рода (у арыйцаў Рудра) пашырылася на шмат паняццяў — прырода, радзіма, гарод, родзічы і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Далей ішлі багі, народжаныя старшым бажаствам: Даждбог, Каляда (зімняе сонца); Пярун — бог грому і маланкі; Купала (летняе сонца) — бог дастатку і ўраджаю; Вярба — багіня вясны, абуджэння прыроды; Тур — бажаство дзікіх звяроў (па назве самага дужага з іх); Лада — багіня кахання; Цёця (у беларусаў) — багіня асенняга ўраджаю; Жыжаль — бог агню; Пераплут — бог вясёласці.

У штодзённым жыцці чалавека існавалі яшчэ духі дабра і зла: Жыцень — жытны дух, Аўсень — дух авечак, а таксама дамавікі, лесавікі (або лесуны), вадзянікі, русалкі, ваўкалакі і інш. Асобна стаялі бажаствы смерці і замагільнага існавання: Баба-Яга — багіня смерці; Зніч — у беларусаў бог пахавальнага агню; Велес — магчыма, выконваў функцыю бога замагільнага свету.

Адносіны да некаторых з гэтых істот у старажытных беларусаў былі амаль прыяцельскімі. Так, каб задобрыць дамавіка, дастаткова было кінуць яму ў прыпечак некалькі зярнятак.

У канцы Х ст. галоўным бажаствам усходніх славян быў Пярун. Гэта адзін са старажытных багоў, культ якога выводзіўся з часоў арыйскай, індаеўрапейскай супольнасці. У літоўцаў ён называецца Пяркунас. У "Аповесці мінулых гадоў" сярод язычніцкіх багоў Пярун названы першым.

У гонар Перуна будавалі капішчы — свяцілішчы, дзе знаходзіліся ідалы с выявай гэтага бога. Яго выявы рабіліся не толькі з дрэва, але і з каменю. Некаторыя даследчыкі лічаць, што знакамітая скульптурная фігура язычніцкага бога, высечаная з пясчаніку (вышынёй 1,2 м), знойдзеная ў 1963 г. на беразе р. Серабранка каля Шклова ("Шклоўскі ідал") і датаваная Х ст., увасабляе сабой Перуна. Іншых выяў Перуна не засталося. Перуну прыносіліся крывавыя ахвяры. Ахвярнай жывёлай, паводле

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старадаўняй традыцыі, лічыўся бык, які сімвалізаваў жыццёвую магутнасць.

Перуна страшыліся і стараліся яго ўлагодзіць, уберагчыся ад яго страшнай кары. Для гэтага выпрацаваўся адмысловы сімвал — круг з абазначэннем шасці радыусаў. У беларускіх вёсках на працягу стагоддзяў гэты знак ставілі на дзвярных шалёўках, каб захаваць хату ад удару маланкі, ад гневу Перуна.

Такім чынам, пры засяленні тэрыторыі цяперашняй Беларусі славянамі, якія змяшаліся з тутэйшымі балтамі, захавалася дахрысціянская рэлігія беларусаў з рэлігійным пантэонам арыйскага паходжання. Пасля прыняцця хрысціянства арыйская культура беларусаў была цесна звязана з хрысціянствам пры захаванні шматлікіх праяў старажытнай арыйскай культуры і арыйскай рэлігіі, вытокамі якіх былі Веды, ведычная літаратура і ведычная рэлігія з культам багоў індаеўрапейскіх плямён, ад якіх паходзіла і старажытная рэлігія нашых продкаў.

**Л.М.Дзіцэвіч,**
*ст. выкладчык*

## БЕЛАРУСКІ БУКВАР: АД З'ЯЎЛЕННЯ ДА СУЧАСНАСЦІ

Яшчэ да з’яўлення першых буквароў літары і склады запісваліся на дошчачках, у берасцяных сшытках, на самшытавых грабянях. Так, пяці—сямігадовы хлопчык Анфім з Ноўгарада надрапаў на бяросце ў XII ст. літары і склады падчас вывучэння граматы. Цэлую нізку берасцяных сшыткаў з азбукай і малюнкамі Анфіма знайшлі археолагі ў праслойцы побач са старажытнай маставой праз семсот гадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ